УДК 81’42

# ЭКСПРЭСІЎНАСЦЬ ЯК ПРАДМЕТ ЛІНГВІСТЫЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

*С. Р. Старавойтава* (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***А. М. Шубадзёрава***,
канд. філалаг. навук, дацэнт

Актывізацыя цікавасці да камунікатыўных аспектаў мовы, у прыватнасці, да праблемы экспрэсіўнасці, тлумачыцца павышанай увагай да праблемы моўнай асобы. Як адзначае лінгвіст В. А. Маслава, «асноўнай функцыяй экспрэсіўнасці якраз і з’яўляецца ўзмацненне ўздзеяння на інтэлектуальную, эмацыянальную і валявую сферы асобы рэцыпіента. Экспрэсіўнасць змяняе эмацыянальны стан носьбіта мовы, уплываючы такім чынам на яго мэтанакіраваную дзейнасць» [1, с. 12].

Маўленне існуе не толькі для таго, каб перадаваць думкі, але і для выражэння пачуццяў. Нашы думкі афармляюцца ў маўленні. Адзінкай маўлення выступае тэкст, які па-рознаму можа быць стылістычна афарбаваны ў залежнасці ад мэты і задачы выражэння думкі. Такім чынам, эмацыянальны стан, які выражаецца моўнымі і маўленчымі сродкамі, суб’ектыўныя адносіны да прадметаў і з’яў рэчаіснасці – гэта і ёсць экспрэсіўнасць тэксту.

Экспрэсіўнасць цесна звязана з эмацыянальнасцю. Эмацыянальнасць адлюстроўвае сэнсавыя адценні слоў і граматычных форм, якія характарызуюцца выражэннем пачуццяў, эмоцый у працэсе стварэння і ўспрымання тэксту. Экспрэсіўнасць суадносіцца з чалавечым мысленнем, а эмацыянальнасць – са сферай пачуццяў чалавека. Часцей за ўсё словы характарызуюцца экспрэсіўнасцю і эмацыянальнасцю адначасова.

Экспрэсіўная сінтаксічная адзінка – гэта варыянт пэўнай нейтральнай сінтаксічнай адзінкі. Экспрэсіўнымі лічацца ўсе фігуры маўлення, большая частка якіх заснавана на законах сіметрыі – сінтаксічны паралелізм, хіязм, полісіндэтон і іншыя. І, наадварот, парушаецца сіметрычная структура ў эліпсісе, парцэляцыі, сегментацыі, інверсіі і інш.

Сінтаксічныя фігуры часта ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, узмацняюць эмацыянальнасць і выразнасць выказвання, пазбаўляюць мову аднастайнасці, тым самым дапамагаюць лепш выявіць вобразную думку пісьменніка, перадаць душэўныя хваляванні.

## Літаратура

1. Маслова, В. А. Лингвистический анализ экспрессивности художественного текста : учебное пособие / В. А. Маслова. – Мінск : Высшая школа, 1997. – 156 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова